Падтрымай "Вясну" на PATREON

Журналістку Ларысу Шчыракову аштрафавалі на 35 базавых велічыняў

10.08.2017 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода слова



Ларыса Шчыракова ў судзе. Фота: baj.by

Суддзя Гомельскага раёна **Андрэй Сусла** пакараў **Ларысу Шчыракову** за супрацу з "Белсатам" без акрэдытацыі (парушэнне артыкула 22.9 КаАП) штрафам у памеры 35 базавых велічыняў — 805 рублёў.

Як паведамляе прэсавая служба БАЖ, журналістка прызнана вінаватай у незаконным вырабе прадукцыі СМІ для тэлеканала "Белсат".

Нагадаем, у ліпені на Шчыракову міліцыя склала адміністрацыйны пратакол за незаконны выраб прадукцыі СМІ. Міліцыянты склалі пратакол за відэасюжэт пра намер уладаў знесці звыш паўсотні прыватных жылых дамоў у Гомелі ў межах вуліц Багдана Хмяльніцкага — праспект Рэчыцкі — Чкалава. Такі намер уладаў выклікаў абурэнне ў шмат каго з тутэйшых жыхароў. Кіраўнікі адміністрацыі раёна і

ўпраўлення архітэктуры горада мусілі збіраць 10 чэрвеня сход гараджан. Пра гэта я зняла відэа і размясціла на платформе відэахостынгавай кампаніі Youtube, некаторыя здымкі тэлеканал “Белсат” скарыстаў у сюжэце: “Чыноўнікі дазволілі будаваць жыллё, а цяпер хочуць знесці яго”.

Шчыракова прышла на суд з вязанкай часныку. Сказала, што гэта трэба, каб фітанцыдамі часныку адпужваць у судзе нячыстую сілу. Мінулым разам журналістка прыходзіла ў суд з вяровачнай пятлёй на шыі.

Супраць сябе журналістка адмовілася сведчыць: "Няма ніякага сэнсу што-небудзь казаць, бо усё адно рашэнне прымаецца не ў судзе, а ва ўладных кабінетах. У судзе толькі афармляюць пакаранні супраць незалежных журналістаў".

Гэта чацвёрты штраф Ларысе Шчыраковай у гэтым годзе за незаконны выраб прадукцыі СМІ. Таксама быў штраф за ўдзел у несанкцыянаваным мерапрыемстве — журналістка працавала падчас мітынгу "недармаедаў" у Рагачове.

Агульная сума штрафаў Шчыраковай сёлета склала 3 381 рубель.

Твитнуть









Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY